БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

22 ЖНІВЕНЬ 1930 г.

Работніцы ф-кі „Чырвоны Тэкстыльшчык“ падпісваюцца на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады“

РАСТУЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ СІЛЫ

Работніцы і сялянкі Кітаю—актыўныя змагары за Саветы.

Сусьветны капіталізм перажывае ў сучасны момант глыбокі эканамічны крызіс. Разам з гэтым нарастае ўздым рэвалюцыйнага руху. Усё гэта яскрава праяўляецца ў калёніяльных краінах. Возьмем Кітай.

Што робіцца там у прамысловых краёх. У Шанхаі 60 проц. шоўкавых прадпрыемств і амаль усе цюцюнавыя фабрыкі пацярпелі банкруцтва (разарыліся). Гэта выклікала вялізарнейшы рост беспрацоўя. Беспрацоўных у шоўкавай прамысловасьці налічваецца—10.000 чалавек, у тэкстыльнай прамысловасьці шмат беспрацоўных. І ў тэкстыльнай і ў шоўкавай вытворчасьці працуюць у большасьці работніцы.

Капіталістыя імкнуцца да больш таннай рабочай сілы, якую лягчэй эксплёатаваць і прыгнятаць, пагэтаму ўсё больш яны замяняюць мужчынскую рабочую сілу жанчынамі і дзецьмі. Напр., на аднэй з тэкстыльных фабрык Шанхаю ў 1927 г. было 40 проц. мужчын, у 1929 г. мужчын засталося толькі адзін працэнт. Рабочы дзень у Кітаі 12—13—14 гадзін. Жыцьцёвы ўзровень надта нізкі. Работніцы тэкстыльных прадпрыемств зарабатваюць у месяц ад 5 да 20 руб.

Працаваць прыходзіцца напружана. Для палудноваьня даюць 5—10 хвілін, нельга нават у ўбіральню схадзіць. Вельмі строга сачыць назорац. Калі марудна работаюць, альбо трошкі больш затрымаюцца ў убіральні, плацяць штраф.

Буржуазія скарыстоўвае жоўтыя прафсаюзы для падаўленьня рабочага руху, для зрыву стачак. Буржуазія спрабуе ашукаць рабочых, выхаваць у іх шавіністычныя (любоў да сваёй бацькаўшчыны, ненавісьць да другіх нацый) пачуцьці. У час здарэньняў на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы яны гаварылі, што СССР гэта чырвоны імпэрыялісты, які нападае на Кітай, трэба абараняць ад яго бацькаўшчыну.

Але гэтая агітацыя не ўдаецца буржуазіі. Рабочая кляса Кітаю яшчэ больш згуртоўваецца вакол Кітайскай кампартыі і чырвоных прафсаюзаў і змагаецца з імпэрыялізмам, са сваёй буржуазіяй і панамі.

Работніцы прымаюць актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. У шанхайскім руху 1926-27 г. і ў Кантонскім яны работалі як выведнікі, работалі на транспарце ў паласе агню, распаўсюджвалі лістоўкі, літаратуру. Сярод 170.500 бастуючых у Шанхаі ў 1928 г. былі 117.974 работніцы.

Работніцы Кітаю актыўныя ўдзельнікі кожнага руху, накіраванага супроць імпэрыялістых. У час падзей на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы адбылася 8 сакавіка дэманстрацыя работніц Шанхаю, у якой удзельнічала 30.000 чалавек; былі і вуліцьныя баі.

Ня лепш і ў сельска-гаспадарчых краёх. Аграрны крызіс абвастраецца. У мінулым годзе ўраджай быў 50 проц. сярэдняга. У 21 правінцыі, маючай 1013 паветаў, быў вялізны голад. Непарыўная драка ваеншчыкаў (мілітарыстых) і бязьлітасная эксплёатацыя сялян узмацняюць голад. Горшыцца жыцьцё сялян, асабліва сялянак, таму што яны да гэтага часу, калі захаваны яшчэ фэадальныя правы над жанчынамі, зусім бяспраўны. Гэта штурхае сялянку на барацьбу за зьвяржэньне паноў і кулакоў.



Асуджаны палітычны дзеяч увозіцца да месца кары ў Пекіне (Кітай).

Сялянкі ўдзельнічаюць у партызанскіх атрадах; работаюць, як сёстры, выведнікі альбо проста як партызаны.

У Кітаі маюцца тэрыторыі, дзе ўлада знаходзіцца ў руках Саветаў. Рабочыя і сяляне Кітаю раўнаюць сваё жыцьцё з жыцьцём рабочых і сялян савецкіх тэрыторый, дзе рабочыя работаюць 8 гадзін, дзе сяляне атрымалі зямлю і палітычныя правы. Гэта дае працоўным упэўненасьць, што, толькі заваяваўшы ўладу, пад кіраўніцтвам кампартыі, яны будуць вызвалены ад уціску паноў і капіталістых.

Шмат работніц Кітаю састаяць у Кітайскай кампартыі. У 1928 г. сярод 3947 жанчын—сяброў партыі, было 3.000 шанхайскіх работніц. За апошні час расьце колькасьць жанчын-партыек.

Усе рэвалюцыйныя аоганізацыі Кітаю працуюць у глыбокім падпольлі. Шмат работніц і рэвалюцыйных сялянак сядзіць у турмах, падпадае катаваньням (рубяць грудзі, выразаюць вочы, перарубаюць папалам).

Вось ужо даўно сядзіць рэвалюцыянэрка т. **Цю**, якая папала ў турму ў час здрады ўханскага ўраду.

Шмат сялянак састаяць у партызанскіх атрадах. Больш за ўсё іх у мясцовасьці—Хэлефон, дзе ў частцы правінцый Савецкая ўлада. Тут мясцовыя сялянкі сьмела нападалі на паноў і зьнішчалі іх.

Усё больш і больш рэвалюцыянізіруюцца работніцы і сялянкі Кітаю.

Мозгіна Вера.

Група трамвайных і амнібусных рабочых, удзельнічаўшых у забастоўцы ў Шанхаі.



Агульны выгляд залі паседжаньня XVI зьезду ЎсеКП(б).

ВЫКАНАЕМ РАШЭНЬНІ XVI ЗЬЕЗДУ ЎсеКП(б).

Згуртоўваючы пад сьцягам Леніна мільёны рабочых, работніц і калгасьнікаў, УсеКП(б) вядзе масы ў разгорнуты сацыялістычны наступ за перамогу сацыялізму ў СССР.

XVI зьезд УсеКП(б) вырашыў важнейшыя пытаньні і вызначыў асноўныя задачы далейшага сацыялістычнага будаўніцтва нашае краіны. Пэрыяд, які прайшоў ад XV зьезду, быў пераломным: для СССР—у бок растучага эканамічнага ўздыму, для капіталістычных краін—у бок эканамічнага заняпаду.

Разгортваючыйся эканамічны крызіс у краінах капіталу набыў сусьветны характар: ён разьвіваецца на базе агульнага крызісу і падрывае частковую капіталістычную стабілізацыю (частковае замацаваньне капіталізму). „Сучасны эканамічны крызіс ёсьць крызіс перавытворчасьці. Гэта значыць, што выраблена тавараў больш, чым можа паглынуць рынак. Гэта значыць, што выраблена мануфактуры, апалу, фабрычна-заводзкіх вырабаў, прадметаў харчаваньня больш, чым могуць купіць на наяўныя грошы асноўныя спажыўцы, г. зн. народныя масы, даходы якіх застаюцца на нізкім узроўні. А з прычыны таго, што пакупная здольнасьць народных мас, ва ўмовах капіталізму, застаецца на мінімальна нізкім узроўні, дык „лішак“ тавараў, мануфактуры і хлеба і г. д. капіталістыя пакідаюць на складах, альбо нават зьнішчаюць, каб утрымаць высокія цэны; вытворчасьць скарачаюць, рабочых разьлічваюць і народныя масы вымушаны пакутаваць з-за таго, што выраблена занадта многа тавараў“ (з дакладу тав. Сталіна).

Такім чынам, атрымоўваецца, што капіталістыя ня могуць знайсьці збыту сваіх тавараў, з прычыны жабрацтва працоўных мас.

У нас-жа, наадварот, з кожным годам паляпшаецца матар'яльнае становішча працоўных мас і таму выяўляецца недахоп тавараў, бо наша прамысловасьць ня можа яшчэ поўнасьцю задаволіць растучыя запатрабаваньні. Значыцца, у капіталістых — цяжкасьці заняпаду, у нас гэта цяжкасьці росту.

Прамысловы крызіс абвастраецца крызісам сельска-гаспадарчым, які прымушае капіталістых скарачаць вытворчасьць.

Каб павысіць цэны ў некаторых мясцох ПАЗШ (Амэрыка), пшаніца і кукуруза ўжываюцца як апал, а ў Бразіліі вялізныя партыі кавы выкідаюцца ў мора.

Разам з гэтым гіганцкі расьце беспрацоўе: напрыклад, у ПАЗШ беспрацоўных больш 6 мільёнаў, у Нямеччыне каля 5 мільёнаў, у Ангельшчыне больш 2 мільёнаў.

Растучы крызіс надзвычайна абвастрае супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі краінамі. Асабліва рэзка абвастрылася барацьба паміж Ангельшчынай і Амэрыкай за сусьветнае панаваньне. Нямеччына задыхаецца ад цяжкасьцяй выплат, якія ёй прыходзіцца плаціць краінам, якія былі пераможцамі ў вайне 14 года.

Разам з гэтым нарастае рэвалюцыйны рух рабочай клясы капіталістычных краін і працоўных калёній. Расьце ўплыў камуністычных партый на рабочую клясу, эканамічная барацьба рабочых усё больш прымае палітычны характар.

Эканамічны крызіс, усё ўзрастаючыя супярэчнасьці ў лягеры імпэрыялістых выклікаюць ліхаманкавую падрыхтоўку да новых імпэрыялістычных боек, у першую чаргу супроць Савецкага Саюзу.

„Узмацніўшыйся развал капіталістычнай стабілізацыі і ўзрастаючы ўздым сацыялістычнай гаспадаркі СССР, як ніколі расчыняюць перад шырачэзнымі масамі рабочай клясы ўсіх краін і прыгнечанымі масамі калёній нямінучасьць краху капіталізму“ (з дакладу т. Молатава).

Усё гэта нябывала ўздымае ролю Савецкага Саюзу ў рэвалюцыйнай барацьбе супроць капіталістычнага ўціску. Усё гэта патрабуе ад працоўных Савецкага Саюзу яшчэ большага згуртаваньня сваіх сіл для ўзмацненьня сацыялістычнага будаўніцтва і абароназдольнасьці СССР.

XVI зьезд сабраўся ва ўмовах агульнага наступу сацыялізму, які быў падрыхтаваны ўсёй папярэдняй работай нашай партыі.

Таму XVI зьезд быў зьездам разгорнутага наступу сацыялізму па ўсяму фронту, правядзеньня ў жыцьцё суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы.

Галоўным сродкам, які забясьпечвае далейшае разьвіцьцё пераможнага наступу сацыялізму, зьяўляецца: шпаркая індустрыялізацыя краіны і суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі.

Сваімі рашэньнямі зьезд забясьпечыў шпаркія тэмпы разьвіцьця цяжкай індустрыі; больш шпарка павінна разьвівацца машынна-будаўнічая прамысловасьць, будаўніцтва варштатаў, трактараў, паравозаў, будаўніцтва электрычных станцый.

Разьвіцьцё цяжкай прамысловасьці дае магчымасьць пашырыць і тэмпы разьвіцьця лёгкай прамысловасьці, што палепшыць снабжэньне спажывецкімі таварамі працоўных.

Ужо ў 1930-31 годзе прамысловасьць СССР дасягне ў асноўным узроўня, вызначанага да канца пяцігодкі.

Ажыцьцяўленьне рашэньняў зьезду па выкананьню пяцігодкі патрабуе ад усяе рабочае клясы яшчэ большай увагі да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Пашырэньне ўдарніцтва і сацыялістычнае спаборніцтва—асноўны сродак да выкананьня гэтых задач.

„Палітыка партыі і яе ЦК забясьпечыла пасьпяховы пераход адсталых і распыленых дробных сялянскіх гаспадарак на рэйкі буйнага сацыялістычнага земляробства, разгортваньне суцэльнай калектывізацыі і пераход да практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы“ (з рэзалюцыі XVI зьезду).

У гэтым годзе пасеўная плошча пад збожжавымі культурамі перавысіла даваенны ўзровень. Адны калгасы перавысілі ў два разы кулацкую вытворчасьць таварнага хлебу ў 1927 годзе. За кошт толькі калгасаў пасеўная плошча пашыралася на 12 мільёнаў гектараў.

Толькі адно простае складаньне сялянскага інвэнтару ў калгасах павысіла вытворчасьць працы калгасьнікаў больш чым на адну трэць (33%) вышэй, чым у адналічнай гаспадарцы. Зразумела, што калі нашы калгасы будуць мець усе неабходныя сельскагаспадарчыя машыны, трактары — вытворчасьць працы яшчэ больш значна павысіцца.

Гэта яскрава паказвае жыцьцёвасьць калгаснага будаўніцтва, перавагу калгасаў, гэта паказвае, што партыя здолее перамагчы ўсе цяжкасьці, якія маюцца ў сувязі з ростам калгасаў.

Далейшае пасьпяховае разгортваньне савгасаў і калгасаў—важнейшая задача, якую высунуў XVI зьезд. **„Цяпер нават сьляпыя бачаць, што зроблен вялізны карэнны паварот сялянства ад старога да новага, ад кулацкай кабалы да вольнага калгаснага жыцьця. Няма больш звароту к стараму. Кулацтва прызначана і будзе ліквідавана. Застаецца толькі адзін шлях—калгасаў. А шлях калгасаў ня ёсьць ужо шлях невядомы і нязьведаны. Ён зьведан і ацанён, як новае даючае сялянам аслабаненьне ад кулацкай кабалы, нэндзы ад цемры. У гэтым аснова нашых дасягненьняў“.**

„Цяпер ужо ня мы адны, кваліфікаваныя бальшавікі, а самі сяляне з калгасаў, дзесяткі тысяч сялян—арганізатары і агітатары калгаснай справы будуць нясьці наперад сьцяг калектывізацыі“. (Сталін).

Далейшае разьвіцьцё калектывізацыі павінна праводзіцца на падставе ленінскіх паказаньняў партыі аб саблюдзеньні дабраахвотнасьці пры стварэньні калгасаў. Асноўнай формай калгасаў павінна быць сельска-гаспадарчая арцель і пераход на статут камуны павінен праводзіцца па меры ўздыму тэхнічнага ўзроўню калгасаў і культурнага разьвіцьця калгасьнікаў.

Далейшае правядзеньне калектывізацыі патрабуе ўзмацненьня работы з беднатой і правільных узаемаадносін паміж калгасьнікамі і адналічнікамі, якім, узорам сваёй працы, калгасьнікі дакажуць перавагу калектыўнага жыцьця.

Зьезд, як адну з важнейшых задач, вызначыў разьвіцьцё жывёлагадоўлі. Нязбожжавыя раёны, да якіх датычыцца і Беларусь, павінны стаць раёнамі з разьвіцьцём жывёлагадоўлі, гародняй і ільняной гаспадаркі.

Сур'ёзную ўвагу зьезд надаў пытаньню культурнай рэвалюцыі, бо шпаркія тэмпы нашага будаўніцтва патрабуюць кадраў падрыхтаваных працаўнікоў ва ўсіх галінах работы, зьнішчэньня няпісьменнасьці, узьняцьця культурнага ўзроўню працоўных мас.

Баявой задачай зьезд вызначыў усеагульнае абавязковае першапачатковае навучаньне.

Выкананьне адказных задач, высунутых зьездам, патрабуе перабудовы работы ўсіх грамадзкіх і савецкіх арганізацый, паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці. Каб забясьпечыць лепшыя формы кіраўніцтва, зьезд вынес пастанову аб ліквідацыі акруг.

Сур'ёзную ўвагу удзяліў зьезд рабоце сярод працоўных жанчын і вынес наступную пастанову: **зьезд абавязвае ўсе партыйныя, прафсаюзныя і іншыя арганізацыі ўзмацніць сваю работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўных жанчын, асабліва на вёсцы, па разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва“.**

Вынікі сацыялістычнага будаўніцтва, якія падвёў зьезд, цалкам пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі партыі. Партыя не змагла-б дабіцца гэтых дасягненьняў у сацыялістычным будаўніцтве без рашучай барацьбы супроць рэштак трацкізму, „левых“ антысерадняцкіх загібаў і правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе.

Зьезд прызнаў погляды правай апазыцыі несумясьцімымі з знаходжаньнем у радох УсеКП(б).

Перад партыяй і на далей стаіць задача непрымірымай барацьбы на два франты, змагацца з „левым“ ухілам і рэштkамі трацкізму і асабліва з правым ухілам, як найбольш небясьпечным на даным этапе.

Разам з гэтым зьезд завастрыў увагу ўсёй партыі на задачах барацьбы з нацыянальнымі ўхіламі ў бок меснага і асабліва ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

Рашэньні XVI зьезду забясьпечваюць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне, таму кожная працоўная жанчына павінна вывучаць рашэньні зьезду.

Аб вясьцілі сацыялістычнае спаборніцтва на выкананьне пляну хлебазагатовак

Ужо зьнялі ўраджай гэтага году, пачаліся хлебазагатоўкі. Посьпех хлебазагатоўчай кампаніі ў значнай меры залежыць ад таго, наколькі ў загатоўках прымуць удзел шырокія масы працоўных.

Таму неабходна згуртаваць увесь бядняцка-серадняцкі актыў на сваячасовае выкананьне плянаў хлебазагатовак. Па Беларусі вызначана нарыхтаваць 12 мільёнаў пудоў. Гэты плян выканаць магчыма, бо ён поўнасьцю адпавядае маючымся хлебным лішкам.

Неабходна, каб увесь закантрактаваны хлеб быў сваячасова здан гаспадаркамі, заключыўшымі дагаворы.

Разам з гэтым неабходна дабіцца, каб у парадку **самаабавязацельства** плян быў пасьпяхова выкананы бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, якія не закантрактавалі свой хлеб.

Для правядзеньня растлумачальнай работы і пасьпяховага выкананьня пляну загатовак, на мясцох ствараюцца **сельскія камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам** з актывістых—батракоў, беднякоў, серадняко ў і калгасьнікаў.

У склад камісіі садзейнічаньня неабходна абавязкова ўцягнуць актыў батрачак, бядняцка-серадняцкіх жанчын вёскі і калгасьніц.

Кожная працоўная жанчына павінна цьвёрда памятаць, што, ня гледзячы на нашы посьпехі ў калектывізацыі і ў ліквідацыі кулацтва як класы, кулак яшчэ захаваў сваю сілу, асабліва ў тых раёнах, дзе малы лік калгасаў і ён шалёна супраціўляецца кожнаму мерапрыемству партыі і Савецкай Улады.

Кулак усімі сродкамі імкнецца перашкодзіць выкананьню пляну хлебазагатовак і спэкуляцыяй хлебам сарваць дзяржаўныя хлебныя цэны.

Кулацтву трэба даць рашучы адпор. **Плян загатовак трэба давесьці да кожнага кулацкага двара, прымусіўшы** кулака ў цьвёрда ўстаноўлены **тэрмін здаць дзяржаве ўсе свае таварныя лішкі.** Ні ў якім разе дапушчаць ніякіх паслабленьняў кулаку.

Разам з гэтым трэба рашуча змагацца з адміністрацыйнымі мерамі загатовак у адносінах бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У адносінах бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, ухіляючыхся ад здачы сваіх лішкаў трэба ўжываць меры грамадзкага вазьдзейнічаньня.

Прыкладам узорнага выкананьня хлебазагатоўчых плянаў зьяўляюцца савгасы і калгасы. Яны адказуць, на кулацкую агітацыю супроць здачы дзяржаве хлебных лішкаў, чырвонымі абозамі і дадуць прыклад адналічным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам у здачы хлеба.

Дэлегацкія сходы працоўных жанчын на вёсцы і ў калгасах павінны правясьці вялікую работу ў ажыцьцяўленьні плянаў хлебазагатовак.

Кожны дэлегацкі сход павінен шырока абгаварыць плян загатовак у сваёй вёсцы, савгасу ці калгасу. Лепшых дэлегатак дэлегацкія сходы павінны вылучыць у склад сельскіх камісій садзейнічаньня хлебазагатоўкам.

Дэлегаткі змогуць дапамагчы пасьпяховаму правядзеньню хлебазагатовак, праводзячы збор тары для нарыхтованага збожжа, арганізуючы пачынаючныя майстэрні для рамонту мяхоў.

Дэлегаткі павінны прыняць удзел у брыгадах, якія ствараюцца для праверкі работы хлебазагатоўчых арганізацый, для барацьбы з спэкуляцыяй хлебам і праверкі выкананьня дагавароў па кантрактацыі.

Дэлегаткі-работніцы павінны прыняць актыўны ўдзел у ствараемых прафсаюзамі брыгадах да пасылкі на хлебазагатоўкі.

Шляхам сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне загатовак, дэлегаткі дакажуць сваю здольнасьць выканаць ускладаемыя на іх задачы.

Датэрміновай здачай збожжа чырвонымі абозамі—замацуем нашы посьпехі і дадзім удар па кулацтву і яго агентах.



Узорны птушыны двор камуны „Гэрольд". Адзіналічнікі часта прыходзяць да агляду яго, вывучэньня і даведак.

Прыкладным правядзеньнем уборачнай

Арганізавана правядзем уборку ўраджаю.

Амаль ва ўсіх калгасах раёну рабочая сіла жанчын разьбіта на брыгады і скарыстана поўнасьцю.

Прыкладам добрай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі можа паслужыць калгас імя „Вароўскага". Жанчыны гэтага калгасу разьбіліся на дзьве брыгады: па ўборцы гародаў і палёў. У брыгадах па 20 чал.

Брыгадзіршы на час уборачнай кампаніі абвясьцілі сябе ўдарнымі па ўборцы ўраджаю, яны аддаюць 10 выхадных дзён для хутчэйшага сканчэньня ўборкі.

Дойніцы вольны ад непасрэднай сваёй працы час аддаюць ўборцы, працуюць на гародзе.

Усё гэта паказвае, што жанчына выросла і зразумела важнасьць яе ўдзелу ва ўсёй правадзімай працы.

Фрумкіна.

Бягомль.

Разгарнулі спаборніцтва.

У калгасе „Новы Шлях" спачатку гэтага году, стварылася некалькі ўдарных брыгад. Кожная брыгада ўзялася шчыра за працу.

Брыгады створаны гэтакія: па жывёлагадоўлі, шаўцоў і на час сяўбы: рольніцтва і ўборачная.

Кожная брыгада мае свайго брыгадзіра, які сочыць за працай.

Зараз паміж брыгадамі заключаны дагавары па сацспаборніцтву.

Жанчыны таксама зьяўляюцца ўдзельнікамі брыгад, уцягваючы адна другую ва ўсю гэтую працу. Зараз калгасьнікі скончылі ўборку сенажаці і распачалі працу па ўборцы ўраджаю.

М. Чубар.

Рудзенскі с.-с.,
Сьмілавіцкага р-ну.



Калгасьнікі рыхтуюцца да ўборкі.

Жаночыя брыгады.

У калгасе імя „16 партызан" складзены 2 жаночыя ўдарныя брыгады, якія ўборку жыта праводзяць па ўдарнаму. Брыгады паміж сабою заключылі сацумовы на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Усе жанчыны выходзяць дружна на работу. Кожная брыгада мае свайго старшага брыгадзіра.

Дзеці калгасьніц знаходзяцца ў ясьлях, якія існуюць у м. Дукора пры калгасе. Дагляд за дзяцьмі добры.

Ц. М. Лявіцкі.

Калгас разгарнуў працу па ўборцы ўраджаю.

Калгас „Новы Шлях" Сьмілаўскага раёну скончыў веснавую сяўбу з посьпехам. Зараз у калгасе ўжо распачалі ўборку збожжа.

Маюцца ўдарныя брыгады, у якіх актыўна ўдзельнічаюць жанчыны.

Жанчыны ўдзельнічаюць і ў вытворчых нарадах. Калгас „Новы Шлях" пачаў будаваць новыя будынкі. Дрэнна, што ў калгасе няма ясьляў і жанчыны нямогуць выйсьці на працу.

Калгасьнік.

П/а Рудзенск, Рудзенскага с.-с.,
Сьмілаўскі раён, Менскай акр.

Веснавую сяўбу правялі па-ўдарнаму.

Прыступілі да ўборкі.

Савгас дапамагае калгасу.

(Сьмілавіцкі раён, Меншчына).

Калгас імя „16 партызан" правёў па-ўдарнаму веснавую пасеўкампанію. Плян веснавой сяўбы перавыканалі на 25 проц., пасеўную плошчу калгас пашырыў на 15 проц. Пасьля сканчэньня веснавой сяўбы ў сябе, калгас дапамог беднякам-адналічнікам у ліку 8 гаспадарак. Увесь час сяўба ішла па-ўдарнаму. Усе калгасьнікі выхадзілі сваячасова на працу, за ўвесь час ня было амаль ніводнага прагулу з боку калгасьнікаў. Жанчыны актыўна ўдзельнічалі ў правядзеньні вясеньняй сяўбы. Былі арганізаваны 2 жанбрыгады з жанчын, якія абвясьцілі сябе ўдарнымі і працу праводзілі па-ўдарнаму.

Цяпер калгас ужо поўнасьцю падрыхтаваўся да ўборачнай кампаніі і ўжо на працягу цэлага тыдню праводзіць ўборку жыта. Ударным тэмпам за ўвесь час уборкі жыта, савгас Дукора дапамагаў калкасу машынамі і працоўнай сілай. Жыта ў калгасе ў некалькі разоў лепшае, чым у індывідуальных гаспадарках. Усе калгасьнікі падзяліліся на ўдарныя брыгады.

Брыгады адна з другой заключылі сацумовы на пасьпяховае правядзеньне ўборкі жыта. Усе машыны ў калгасе спраўны і праца па ўборцы жыта ідзе па ўдарнаму.

Ц. Лявіцкі.

Мы—ударніцы.

У калгасе імя „Леніна" маецца некалькі жанчын-актывістак, якія ўвесь час актыўна працуюць у калгасе і ў сучасны момант на час уборкі ўраджаю абвясьцілі сябе ўдарніцамі.

10 жанчын-ударніц арганізавалі ўдарную брыгаду, якая будзе вязаць снапы. Ударніцы таксама ўступаюць у сацспаборніцтва паміж сабою.

С. Путрык.

в. Клінок, Чэрвенскага раёну.

КАМПАНІІ ДАКАЖАМ ПЕРАВАГУ КАЛГАСАЎ

Спаборнічаем на лепшую ўборку ўраджаю.

Наш інтэрнацыянальны калгас „Рэвалюцыйны выбух“ яшчэ малады, ён існуе толькі першы год, але працуе ён добра.

Мы ўжо ўбралі 66 гектараў ячменю, заканчваем уборку жыта і сенажаці. Гарод апрацавалі лепей за ўсіх—кажа інструктар з раёну.

Мы спаборнічаем з Парыцкім калгасам. Спаборніцтва гэта добра праходзіць: на працы ўсе імкнуцца не адстаць і выклікаюць іншых.

Ва ўборцы сенажаці нам дапамагла брыгада комсамольцаў, якія арганізавалі „суботнік“ у выхадны дзень. Некаторыя комсамольцы ўжо два тыдні працуюць. Пабольш-бы нам гэтакіх.

Ураджай у нас у гэтым годзе добры. Харчуюцца калгасьніцы таксама дастаткова. Кепска толькі, што нам далі непадрыхтаваную загадчыцу дзіцячай пляцоўкі, яна ніводнага разу ня склікала сходу і пляцоўка не працуе. Калі маткі ідуць на працу, дык кідаюць дзяцей у зачыненай хаце.

Глускі раён. **Уфлянд П.**

Ад рэдакцыі. Мы чакаем адказу праўленьня калгасу аб тым, што зроблена па ўзмацненьню працы пляцоўкі.

Парыцкія калгасьніцы, напішэце, як вы выконваеце свой дагавор па сацспаборніцтву.

Чаму калгасьніцы не працуюць?

(Высачанскі раён).

У калгасе „Сацыялістычная Бацькаўшчына“ ёсьць шмат працаздольных жанчын, вольных ад маленькіх дзяцей, але чамусьці ня ідуць на палявую работу. Яны размаўляюць гэтак: „калі мой гаспадар працуе, дык я і дачка не павінна ісьці на поле“.

Напрыклад, **Голенькая Марыля, Голенькая Кацярына** і іншыя не працуюць: яны не разумеюць таго, што толькі пры спорнай дружнай працы ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц будзе мацнець гаспадарка калгасу і палепшыцца дабрабыт калгасьнікаў.

А між тым, калгасьнікі дрэнна падрыхтаваліся да ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы.

У той час, як у іншых калгасах дружна ўзяліся за працу і калектыўна зьбіраюць ураджай і з палёў калгасу і з тых, што з восені сеялі індывідуальна, у арцелі „Сацыялістычная Бацькаўшчына“ разважаюць: агульна ці паасобку ўбіраць палі калгасьнікаў?

К.

АД РЭДАКЦЫІ. Мы чакаем ад калгасьніц-актывістак водгукаў, што яны зрабілі, каб уцягнуць у працу ўсіх жанчын калгасу.

Сялькоркі, пішэце, што робіць ваш калгас па ўборцы ўраджаю і асеньняй сяўбы.

Пашыраем калгасную гаспадарку.

У вёсцы Раўнапольле стварыўся калгас „Савецкая Беларусь“. З ста гаспадароў у калгас увахадзяць толькі 17. Адразу ў калгасе праца вельмі кепска праводзілася, нават гародніна, якая была засеяна, прапала ўся ў траве.

Але зараз праца палепшылася, дзякуючы таму, што вылучылі старшынёй калгасу тав. Нядбальскага. Распачата будоўля новых хлявоў для жывёлы. Пачалася сенажаць, ідзе і жыта. Адчыніліся ў маі ясьлі, у якіх маецца 15 дзяцей, яны працуюць з кожным днём усё лепей.

Загадчыцай ясьляў вылучана з свайго калгасу т. Шылай. Кухарка і нянька таксама калгасьніцы, яны добра глядзяць за дзяцьмі.

З дэлегаткамі-жа працы няма ніякай. Жанарганізатар наша паехала ў адпачынак, а калі і дома была, дык ніяк не змагла склікаць сходу. Актыўныя дэлегаткі разьехаліся, а астатнія больш цікавяцца вечарынкамі, якія не даюць ніякай карысьці.

Роза М.

Сьмілаўскі раён,
Рудзенскі с.-с.

Селькоркі, пішэце як праходзе ў вас уборка ўраджаю, як праходзяць хлебазагатовак; пішэце як праходзе ў вас падпіска на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады“.

Кніганошы-калгасьніцы разносяць літаратуру на полі.

Усе выпісваем „Белрабсялянку“

Калгасьніцы калгасу імя „10-ці годзьдзя БССР“ Магілеўскага раёну добра ўцягнуты ў культурную працу. Калі выпускаецца насьценгазэта, вялікі ўдзел прымаюць у выпуску яе калгасьніцы.

Гэта ўсё дзякуючы таму, што калгасьніцы выпісваюць часопіс „Белрабсялянку“. Усяго выпісваюць 45 экзэмпляраў.

Галоўчыны,
Магілеўск. акр.

Мода.

ПАЗЫКАЙ ДАПАМОЖАМ ХУТЧЭЙШАЙ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНЫ

Перадавікі па падпісцы на пазыку. Работніцы мякка-шакаладнага цэху фабрыкі „Камунарка", якія падпісаліся на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" больш чым на 100 процантаў сваёй месячнай пэнсіі:

1. Прэсман.
2. Розэнблюм.
3. Эйшынская.
4. Кавалеўская.

Пазычылі месячную зарплату на індустрыялізацыю.

(фабрыка „Камунарка")

Хутка праходзіла ў нас падпіска на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады". Па ўсіх куткох фабрыкі праводзіліся нарады брыгад. Падпіска праходзіла жвава. 70 проц. рабочых і работніц нашай фабрыкі падпісаліся на месячную заработную плату, астатнія на 2-тыднёвую заработную плату. **Фэльдман.**

Менск.

Панчошніцы на чырвонай дошцы.

(*г. Віцебск*).

Работніцы панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін добра ўсьвядомілі задачы выкананьня пяцігодкі. Яны першыя выканалі дагавор па сацспаборніцтву; за перавыкананьне прамфінпляну фабрыка праз друк зьмешчана на чырвоную дошку.

Работніца Меншвэю т. Казлова падпісалася на 100 руб. пазыкі індустрыялізацыі; атрымлівае яна 72 руб. пэнсіі.

У другім годзе пяцігодкі, асабліва ў першае паўгодзьдзе, фабрыка мае добрыя вынікі: прамфінплян выкананы на 101,6 проц.

Што спрыяе гэтакай пасьпяховасьці працы?

На фабрыцы ёсьць работніцы, якія працуюць на 12 варштатах, не адна, а шмат работніц гэтак працуе. Увесь калектыў панчошніц абвясьціў сябе ўдарным: фабрыка і сапраўды працуе па ўдарнаму.

Работніцы кажуць: „прагульшчыць і ілжэўдарніц у нас ня стала з першага дню заключэньня сацдагавору. У 1929 годзе, мы сваячасова з гэтым змагаліся".

Фабрыка перавыканала плян ня толькі па колькасьці прадукцыі, але за першае паўгодзьдзе процант зьніжэньня сабекошту даведзены да 10,3 проц. супроць намечанага па праграме 8,3 проц., а якасьць прадукцыі ўсім добра вядома: у крамах заўсёды спажыўцы просяць: „дайце віцебскія панчохі".

Бесьперапынка і трохзьменная праца далі на фабрыцы добрыя вынікі: павялічыўся процант выпрацоўкі прадукцыі на 40 проц., гэта дало дастатковага прыбытку, каля 850 тысяч рублёў у год, а рабочая сіла павялічылася на 30%.

На сёнешні дзень маюцца ўсе ўмовы для перавыкананьня прамфінпляну.

Каржыцкая.



Узорнае правядзеньне уборкі ураджаю і правільнае разьмеркаваньне яго ў колгасах дасьць новае папаўненьне калгасьнікаў



Калгасьнікі з калгасу „Расьсьвет-Пераможца" ў першых радох уборачнай кампаніі.

Разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў у калгасах зараз важнейшае пытаньне, якое цікавіць усіх калгасьнікаў. Ад таго, наколькі добра арганізавана праца ў калгасах, сваячасова праведзена ўборка і правільна разьмеркаваны ўраджай—залежыць у значнай меры прыцёк у калгасы новага папаўненьня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Кулацкія элемэнты, жадаючы перашкодзіць арганізацыі калгасаў, распаўсюджваюць чуткі, што ў калгасе сяляне будуць галадаць, што ўвесь ураджай забярэ дзяржава, а калгасьнікаў пасадзяць на „галодны паёк".

Правільнае разьмеркаваньне ўраджаю і прыбыткаў у калгасах ударыць па кулацкай хлусьні.

Усе пытаньні, зьвязаныя з разьмеркаваньнем ураджаю і прыбыткаў, павінны вырашацца самымі калгасьнікамі, на агульным сходзе калгасьнікаў.

Як-жа трэба разьмяркоўваць прыбыткі і ўраджай у калгасах?

Згодна парадку, устаноўленаму Калгасцэнтрам, **аплата працы калгасьнікаў павінна праводзіцца па колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным калгасьнікам на работах у калгасе.**

Для таго, каб правільна разьмеркаваць ураджай, перш за ўсё трэба падлічыць усе прыбыткі і выдаткі гаспадаркі калгасу.

Пяць процантаў з валавога ўраджаю калгасу і прыбыткаў з абагуленай калгасьнікамі малочнай жывёлы разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі адпаведна маемасьці, унясёнай імі ў абагулены фонд калгасу.

Гэта робіцца дзеля таго, каб замацаваць калгасы, замацаваць серадняка ў калгасе.

Пасьля гэтага з ураджаю калгасу адлічваецца насенны фонд, кармавы фонд для маючайся абагуленай жывёлы, а таксама для тэй, якая будзе набыта ў наступным годзе.

Сабраўшы ўраджай, кожны калгас павінен выканаць свае абавязкі перад дзяржавай: пагасіць насенныя пазыкі і здаць па кантрактацыі лішкі свайго ўраджаю.

Астатняя частка ўраджаю разьмяркоўваецца для здавальненьня патрэб калгасьнікаў, а таксама для бытавых устаноў (яслі, сталоўкі, дзіцячыя пляцоўкі). Калі пасьля гэтага яшчэ застануцца лішкі ўраджаю, іх трэба прадаць дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям.

Апрача прыбыткаў у натуральным выглядзе, калгас будзе мець прыбыткі і грашыма, ад розных падсобных прадпрыемстваў, прадажы прадуктаў па кантрактацыі і іншых.

У першую чаргу з гэтых грошай трэба пагасіць сельскагаспадарчы падатак, страхоўкі, плацяжы па крэдыту і іншыя.

З ураджаю і прыбыткаў калгасу, пасьля адлічэньня ў насенны фонд, кармавы фонд, аплаты выдаткаў па сельскагаспадарчаму падатку, і страхаваньню калгаснай маемасьці, выдзяляецца **непадзельны капітал** у разьмеры ня звыш 10 процантаў і грамадзкія фонды ня звыш 5 процантаў: на культурнае абслугоўваньне калгасьнікаў, стварэньне ясель, сталовых і іншых бытавых устаноў, на выдаткі па аказаньні дапамогі непрацаздольным і часова страціўшым працаздольнасьць калгасьнікам.

Сродкі, якія застануцца пасьля стварэньня непадзельнага і іншых фондаў, пагашэньня абавязацельстваў калгасу, павінны складаць грашовы фонд для аплаты працы калгасьнікаў.

Аплата праводзіцца, як мы паказалі раней, у залежнасьці ад колькасьці і якасьці працы калгасьнікаў. За роўную працу—роўная аплата. Гэты парадак дае магчымасьць значна павысіць вытворчасьць працы калгасу, бо кожны калгасьнік і калгасьніца будуць ведаць, што чым лепш будуць працаваць калгасьнікі, тым больш будуць прыбыткі калгасу і, значыцца, яго самога.

Канчатковае разьмеркаваньне прыбыткаў будзе праводзіцца ў канцы гаспадарчага году, калі точна будуць падлічаны ўсе прыбыткі. Аднак раіцца, пасьля сканчэньня ўборкі і абмалоту, правесьці разьмеркаваньне атрыманых прадуктаў у рахунак канчатковага разьліку.

Уся праца па ўборцы і разьмеркаваньню ўраджаю павінна відавочна паказаць перавагу агульнай калектыўнай працы, стварыць новы моцны прыцёк у калгасы тых сялян беднякоў і сераднякоў, якія ўстрымліваюцца яшчэ ўступаць у калгас.

Правільнае правядзеньне ўборкі і разьмеркаваньня ўраджаю—гэта яшчэ адзін удар па кулаку.

А. Г.

Барацьбой з прагуламі дасягнем ўстанаўленьня працоўнай дысцыпліны ў калгасах



Трактарная станцыя калгасу „Гігант".

Калектыўна сабяром ураджай.

(Лагойскі раён).

На раённую канфэрэнцыю калгасьніц сабралося каля 200 жанчын.

Удзел жанчын ва ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніях—было галоўным пытаньнем канфэрэнцыі.

Усе дэлегаткі аднагалосна заяўлялі:

— Разам з калгасным жытам убярэм палі калгасьнікаў, якія ўвосень індывідуальна пасеялі жыта.

Канфэрэнцыя паказала, што жанчыны ў калгасах актыўна ўдзельнічаюць у працы калгасаў, у павялічэньні пасеўнай плошчы, таварнасьці гаспадаркі і ў паляпшэньні якасьці працы на полі.

— Кулацкія элемэнты, адчуваючы сваю хуткую гібель, імкнуцца перацягнуць на свой бок адсталую, няпісьменную частку жанчын, каб праз іх разбураць калгасную гаспадарку,—кажа дэлегатка т. Гладкая:—нам патрэбна ўсіх калгасьніц зрабіць пісьменнымі.

Некаторыя выказваліся наконт працоўнай дысцыпліны: у некаторых калгасах маткі не нясуць сваіх дзяцей у ясьлі, каб, хаваючыся за дзяцьмі, ухіліцца ад працы на полі. „Трэба, каб усе калгасьніцы насілі сваіх дзяцей у ясьлі,"—заяўлялі дэлегаткі.

З асаблівай увагай выслухалі дэлегаткі выступленьне **Матруны Мароз** з калгасу імя „Дзяржынскага"; 5 дзяцей яе—піянэры і камсамольцы, а сама яна ўступіла ў партыю.

Тав. Мароз упэўнена даводзіла перавагу калектыўнай гаспадаркі перад індывідуальнай.

Канфэрэнцыя пастанавіла: у час уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаній кожная калгасьніца павінна завербаваць адну сялянку ў калгас.

В.

Калгас „Страх Ворагам" апраўдвае сваё ганаровае прозьвішча.

Калгас „Страх Ворагам" абвясьціў сябе ўдарным. Усе галіны працы вядуцца ўдарнымі тэмпамі. Калгасьніцы вядуць барацьбу з прагульшчыкамі.

Дапамагае ў гэтым і насьценгазэта. Шмат калгасьнікаў удзельнічаюць у ёй. За якасьць газэты калгас атрымаў прэмію. На відным месцы вісяць у калгасе чорная і чырвоная дошкі.

Хто ні праходзіць чытае па некалькі разоў: „Зайцман Цімох за нядбайнасьць да працы, за грубыя адносіны да калгасьніц"—на чорнай дошцы.

Вось і Настуля з Галенкай чытаюць і сьпяшаюцца, бо спозьнішся падаіць кароў, раз, другі, а там глядзі і на чорную дошку... які сорам!

А Цімохава прозьвішча цэлы месяц вісіць на чорнай дошцы—уся ваколіца чытае.

Цяпер ён добра працуе, але вельмі хвалюецца, што на дошцы вісіць.

Ня горш скарыстоўваюцца камсамольскія вячоркі і чырвоныя вясельлі. На адным чырвоным вясельлі актыў калгасаў вітаў адданых калгасу працаўнікоў, а потым і за прагульшчыкаў узяліся.

Калгас пазбавіўся ад прагульшчыкаў і прагульшчыц яшчэ не канчаткова.

Добра пастаўлена праца сталоўкі; у ёй 70 асоб харчуецца.

40% калгасьнікаў — камунары; абагулілі ўсю сваю маемасьць і жывёлу.

Працы калгасу яны вельмі адданы.

Сьвіная гаспадарка калгасу з 58 вялікіх сьвіней вельмі добра даглядаецца. Сьвіньні-маткі разьмешчаны паасобку ў новенькім выбеленым вапнай будынку, зробленым па апошняму слову тэхнікі.

94 цялят разьмешчаны, кожны у асобным месцы ў кармушкі. Для кароў маюцца стойлы.

Удзел камунарак і большасьці астатніх калгасьніц у працы вельмі добры.

У калгасе маецца млын, дзе працуюць самі калгасьнікі: сукнавальня, кузьня, цагельня і малочная, якая штотыднёва адпраўляе ў горад для рабочых сыр, масла, каля 20 пудоў.

Цяпер калгасьнікі сябе трохі сьцясьняюць з сьвінінай, але за гэта ўвосень падгадуюць сьвіней, цялят; і сабе будзе і ў горад адправім, бо цяжка рабочым бяз мяса,—кажа латышка жывёлавод калгасу.

Уборачныя работы ідуць ударнымі тэмпамі. Вывезьлі гной, бяз трактара ўзьнялі ўвесь пар. Сенакос распачалі, скасілі 20 гектараў.

Культасьветная праца ажывае. Калгасьніцы правялі 100% падпіску на часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка", працуе гурток, па распрацоўцы пастаноў 16-га партзьезду, гурток прыхільніц часопісі „Белрабсялянка", працуе брыгада сялькорак-камунарак.

Калгас перавыхоўвае калгасьнікаў у сапраўдных камунараў на „Страх Ворагам".

Каржыцкая.



НА ПАБУДОВЕ

Апавяданьне БЕЛІНА-ПАДГАЕЦКАГА

Маленькі пакойчык у кутку калідору рабочага клюбу, дзе зьмяшчалася бюро ячэйкі, як заўсёды, быў поўны партыйцаў. Частка з іх прыйшла прама з працы, у пакрытай вапнаю вопратцы, а іншыя ўжо пасьпелі пераапрануцца.

— Так вось, таварышы,—заявіў сакратар ячэйкі.—Нам засталося абгаварыць толькі апошняе пытаньне—заяву таварыша Сьмірновай.

І ўжо другім голасам ён працягнуў:

— Маруська просіць бюро накіраваць яе на вучобу. Тэхнікам, а потым можа інжынэрам хоча зрабіцца.

— Да няўжо-ж?—закрычаў нехта. Бабы нашы ў спэцы прабіраюцца, чулі, хлопцы?

— Ты не жартуй, Цімох,—строга застанавіў яго плотнік Астапаў.—Вучоба добрая справа. Толькі больш-бы нам гэтых спэцаў з рабочых мець.

— Я так думаю, таварышы, што бюро павінна згадзіцца з просьбай таварыша Сьмірновай,—зьвярнуўся ён да сябраў бюро,—яна добра скончыла курсы дзесятнікаў і зараз спраўляецца з працай на пабудове. Няхай вучыцца далей.

З думкай Астапава згадзіліся. Да Сьмірновай адносіліся з пашанай. Яе шанавалі за цьвёрдасьць, за вялікі энтузіязм у рабоце, за чулыя адносіны да таварышоў.

— Ну, што-ж язжай, Сьмірнова!—сказаў сакратар, зачыняючы пасяджэньне бюро.—Вучыцца трэба; каб сацыялізм будаваць, нам кадры патрэбны.

Прайшло некалькі год. Сьмірнова з посьпехам скончыла сваю вучобу і яшчэ больш горача аддалася працы.

— Няма часу адпачываць!—бадзёра адказвала яна тым, хто зьдзіўляўся яе беспрадзельнай занятасьці і раіў ёй паклапаціцца аб сваім здароўі.

— Цяпер няма часу адпачываць, бачыце, як ідзе ў нас будоўля?

І, схіліўшыся над плянамі, яна зноў прымалася за розныя разьлікі, ці бяжала на рыштаваньня пабачыць, як кладуць сьцяну муляры, ці хапае ў іх цэглы і цэмэнту.

На трэці год сваёй працы Маруся Сьмірнова была вылучана кіраўніком работ вялікай пабудовы заводу.

* * *

Інжынэр Зеверынг быў запрошан з Нямеччыны кіраўніцтвам пабудовы для нагляду за пабудовай заводу, на якім у якасьці прараба працавала Сьмірнова.

Сёньня ён быў незадаволен работай на пабудове.

Падняўшыся разам з Сьмірновай, на чацьверты паверх пабудовы, ён спаткнуўся з агідным малюнкам. Чатыры сэзоньніка—барадатыя дзядзькі сядзелі ў кутку і расьпівалі гарэлку. Яны спачатку ня прыкмецілі набліжаючыхся да іх інжынэра з прарабам і працягвалі весела перагаварвацца паміж сабою, запамятаўшы зусім аб спыненай у рабочы час працы.

„П'янства на пабудове. П'янства, якое перашкаджае нармоваму ходу работ і разбураюча ўплывае на будаўнікоў. Вось як яны працуюць... Ці так магчыма?"--горка падумала Сьмірнова і, зьвярнуўшыся да сэзоньнікаў, яна заявіла: — забярэце інструманты і зьвяртайцеся ў кантору.

— Дык як-жа гэта таварыш прараб?—запытаў яе адзін з сэзоньнікаў:—зразумела, піць на пабудове немагчыма, але-ж гэта выпадкова было...

— А працуеце вы як? Бачыце, усю сьцяну сапсавалі, ці-ж гэта кладка?

На пасяджэньні РКК, куды зьвярнуліся зволеныя за п'янства сэзоньнікі, хутка вырашылі гэта пытаньне. Рабочая частка РКК згадзілася з думкай аб неабходнасьці зволіць нядбайна адносячыхся да працы сэзоньнікаў, тым больш, што пры разглядзе справы высьветлілася, што дома яны маюць заможную гаспадарку і на пабудову прыйшлі на ўсякі выпадак, каб відавочна запасьціся прафэсыйным білетам.

Раззлаваныя, зьвярталіся сэзоньнікі ў інтэрнат.

— Праклятая баба!—мармыталі яны па дарозе.—Камуністка стрыжаная!

—Што, дзядзькі, насыпавесілі?—запытаў, сустрэўшыся з імі, рахункавод Круціловіч.

— Бачыш справа то якая? Выгналі нас...

— Ведаю, братцы,—засьмяяўся Круціловіч.— Сьмірнова гэта.

— Але будзе яна нас памятаць!—з пагрозай выклікнуў адзін з зволеных.

— Ці не прайціся нам да аднаго з маіх прыяцеляў? Там пагаворым,—хітра ўсьміхнуўся Круціловіч.

. . . . . .

— Ды значыцца, разьлічылі вас? Так, так. Ну, а ў вёсцы як?—запытаў Круціловіч знаёмых.

— Ды як у вёсцы,—хмура заўважыў адзін з муляроў па прозьвішчу Гняды,—ёваяк і той з вёскі піша: калгас зьбіраюцца ў вёсцы стварыць.

— Так, так,—падтрымаў Гнядога

Круціловіч,—так што бачыце, дзядзькі, справа тут ня толькі ў Сьмірновай.

— Зразумела. Ведаем, не маленькія. Усе гэтыя камуністы адным лыкам шыты.

—Ды што аб гэтым гутарыць...—нерашуча пачасаў патыліцу Паўлючонак.

— А ты, Міхась, усё яшчэ не пазнаў мяне?—з усьмешкай запытаў яго Круціловіч,—а я вось адразу цябе прызнаў, хаця і шмат вады ўцякло з нашай апошняй сустрэчы... у Чорнага Бора.

—Дык вось яно што,—зьдзіўлена прамармытаў Паўлючонак.

* * *

Праз дзень зволеныя з пабудовы сэзоньнікі, забраўшы свае пажыткі, накіраваліся ў сваю вёску. вось сёньня раніцай кран павінен быў пачаць працу.

—Бачыце, братцы, уздымаецца!—крычалі рабочыя, закінуўшы ўверх галовы, яны сачылі як плаўна ўздымаўся кран на высокі паверх.

— А колькі цэглы адразу ўзяў з сабою! Цяпер куды лягчэй будзе працаваць.

Раптам нешта затрышчала наверсе. Матор запыхаў, як бы задыхаючыся ад непасільнай працы.

— Валіцца, валіцца!—Стогнам пранясłося па пабудове.—Ратуйцеся!

Але было ўжо позна. Рухнуўшая з трэцяга паверху клець з цэглай прыдавіла двух, не пасьпеўшых адбяжаць, рабочых. І цяпер яны, няпрытомныя, ляжалі на грудах цэглы.



Чатыры сэзоньнікі сядзелі ў кутку і расьпівалі гарэлку.

— Так вы ўжо, Міхась Захарыч, жонкі маёй не астаўце,—праважаючы Паўлючонка, прасіў стары плотнік Байко.

— Але, як-небудзь дагаворымся з Лукер'яй,—хлопнуў па плячу Байко Паўлючонак,—суседзі... Ну бывай, Сьцяпан, калі будзеш у вёску пісаць, лішняга не балтай.

— Разумею, Міхась Захарыч...

II

На пабудове пачаў працаваць новы пад'ёмны кран. Гэты кран значна палегчыў працу рабочых, ён падаваў на ўсе паверхі пабудовы цэглу, жалеза, цэмэнт і дошкі. Кран быў гонарам Сьмірновай, якая ўжо даўно дабівалася мэханізацыі работ на пабудове.

Матор быў праверан, у свой час, спэцыяльнай камісіяй. Працаваў ён чотка без перабояў, і

Матор быў сапсованы чыёй-та злачыннай рукою—гэта ўстанавіла вылучаная адразу-жа пасьля здарэньня, спэцыяльная камісія.

* * *

— Зразумела, віноўна адміністрацыя—гаварыла Сьмірнова, нэрвова расхаджваючы ў пакоі, дзе толькі што было паседжаньне бюро ячэйкі.

Мяне выклікалі ў горад, а намесьнік запамятаў замяніць, захварэўшага вартаўніка. Але справа тут ня ў гэтым. Хто шкоднік, хто сапсаваў машыну?—вось у чым пытаньне. Раней машына была ў парадку.

— Ці не кулакі гэта, якіх мы зволілі з пабудовы?—запытаў Астапаў. Ад іх магчыма гэтага чакаць.

— Спачатку і ў мяне была такая думка, але міліцыя правярала: яшчэ за два дні да катастрофы яны пайшлі ў вёску.

— Ну, гэта іншая справа,—адказаў Астапаў,—але-ж хто тады?

— Над гэтым я і ламаю галаву—усхвалёвана гаварыла Сьмірнова.

— Інжынэр наш сумленны спэцыялісты, у канторы як быццам няма каго западозрыць. Круціловіч, хоць і не спадабаецца ён мне, але ён рабкор, удзельнічае ва ўсёй грамадзкай працы. На рабочых таксама няма на каго думаць.

— Таварышы! Рабочыя на пабудове сабраліся,—сказаў, убягаючы, сакратар ячэйкі.

. . . . . .

Працяжна заве гудок. Стомленыя рабочыя пасьпяхова зьбіраюць інструмэнты, мыюць рукі і сьпяшаюцца на сход. Усіх хвалююць прычыны катастрофы, прычыны сьмерці 2-х таварышоў.

— Тут толькі адміністрацыя і віноўна—гаварыў, хітра аглядаючы ўсіх, плотнік Байко.—Вартаўніка да крану ня прыставілі, ці-ж гэта справа? Вось 2-х людзей на той сьвет і адправілі. Менш спалі-б.

— А ты не траплі языком, Сьцяпан—прарваў яго рабочы Курцік.—Ты-ж ведаеш, Сьмірнова заўсёды за паўгадзіны да пачатку работ на пабудове.

— Тут ня ў Сьмірновай справа. Тут шкодніцкая работа.

— Шукаюць шкодніка, а ці-ж сярод іх саміх ня трэба пашукаць?—мармытаў Байко.

— Дык вось, таварышы,—скончыў свой даклад сакратар ячэйкі:

— Банда шкоднікаў, якая пакуль яшчэ ня знойдзена намі, сапсавала матор. Гэта выклікала сьмерць двух нашых таварышоў. Злачынцы будуць знойдзены і панясуць належную кару, але гэты выпадак яшчэ раз настойліва гаворыць нам аб тым, што вакол нас клясавыя ворагі. Рабочая кляса павінна зорка сачыць за вылазкамі ворагаў, узмацніць сваю пільнасьць.

З вялікім абурэньнем сустрэлі рабочыя шкодніцкую вылазку ворага.

— Не дадзім шкоднікам перашкаджаць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву! Яшчэ больш нанапружым нашы сілы. Будзем зорка сачыць за ворагамі,—так заявілі рабочыя.

Тут-жа на сходзе дзесяткі новых рабочых падалі заявы аб стварэньні ўдарных брыгад.

Прайшло некалькі дзён. Работа на пабудове зноў вайшла ў сваю калею. Мотор быў спраўлены.

Сьмірнову, як адказнага кіраўніка работ, некалькі разоў выклікалі ў пракуратуру, выканком, але віноўных пакуль не знайшлі.

Усё гэта вельмі хвалявала Сьмірнову.

А між тым, хто-та ўпарта распаўсюджваў чуткі, што Сьмірнова прычасна да шкодніцтва.

III

Як і заўсёды ў базарныя дні, у заезжым доме Мінкіна было поўна. За сталамі на доўгіх лаўках расьселіся сяляне, сьнедалі, пілі гарбату.

— Таварыш Воўк, адкуль гэта ты?—запытаў малады хлапец дзяўчыну, сустрэўшыся з ёю на ганку.

— Ды вось з гораду еду ў сваю вёску,—адказала Воўк сябру сельсавету, разматываючы хустку з галавы і прысаджваючыся на лаўку.—Трэба каня накарміць.

... Ты кажаш, нельга?—заплятаючымся языком, спрачаўся з суседам селянін, які сядзеў недалёка ад дзяўчыны.—Сельсаветчык?—і не з гэтакімі, брат, спраўляліся.

— Дык гэта Гняды!—падумала Воўк, прыслухоўваючыся да п'янага мармытаньня.—Што ён так сёньня разараецца!

— Ты ня ведаеш? Была баба ў нас, прарабам на пабудове... Сьмірновай звалі.

— Сьмірнова... прараб—на пабудове... сапсованая машына. Я нешта чула аб гэтым,—падумала пра сябе Воўк.

А Гняды тымчасам працягваў:

— Так-та, браток. Гэта Паўлючонак прыдумаў і яшчэ нехта. Але хутка вечар на двары. Трэба ехаць...

... У гэты дзень з Троіцкай пошты пайшло ў горад адным лістом больш звычайнага. Ліст гэты быў адрасаваны ў рэдакцыю мясцовай газэты.

Ліст дэлегаткі прайшоў свой звычайны шлях; з рэдакцыі ён быў накіраваны ў мясцовую пракуратуру.

А праз пару дзён, пасьля гутаркі, якую вёў Гняды з сваім прыяцелем, у заезжым доме, міліцыя забрала ў вёсцы Горкі Паўлючонка, Гнядога і яшчэ двух, зволеных за п'янства на пабудове, сэзоньнікаў.

На вочнай стаўцы з дэлегаткай Воўк, Гняды, прыпёрты да сьцяны, прызнаўся ва ўсім. Ён расказаў сьледчым органам, ва ўсіх падрабязнасьцях, гісторыю свайго шкодніцтва.

— Для чаго вы гэта зрабілі?—запытаў сьледчы.

— Ды так. Вельмі ўжо за сэрца нас узяло гэта звальненьне. Адпомсьціць хацелі.

— А хто гэта быў з вамі?

— Рахункавод пабудовы Круціловіч. Ён і навучыў гэта зрабіць.

Сьледчы тав. Сафронаў сядзеў у сваім габінэце і, пераліствaючы сінія папкі з справамі, чакаў, калі прывядуць на допыт, сёньня раніцай арыштованага, Круціловіча.



— Валіцца, валіцца!.. Ратуйцеся!

— Дзе я бачыў гэтага чалавека?—мільганула ў галаве ў сьледчага, калі два ўзброеных міліцыянэры ўвялі ў пакой Круціловіча. Так, так дзе-та, толькі не памятую дзе.

І рашыўшыся праверыць свае падазрэньні, ён нечакана казаў: гэта ты нарэшце Кавалёў?

— Які Кавалёў?.. Я нічога ня ведаю, — усхвалёвана замармытаў арыштованы. — Вы памыляецеся, таварыш сьледчы.

— Не, не памыляюся. Да рэчы, гэта я лавіў тваю банду ў 1920 г. ці ты запамятаў Чорны Бор, дзе твая банда кулакоў расстрэльвала захопленых камуністых?

. . . . . .

Сёньн Сьмірнова адчувала сябе такой шчасьлівай, такой поўнай сіл, яшчэ больш гатовай да барацьбы, чым раней.

— Шкоднікі ўскрыты,—думала яна, накіроўваючыся на пабудову—а цяпер трэба яшчэ больш працаваць, каб цалкам выканаць наш плян будаўніцтва.

Ветліва сустрэлі працаўнікі Сьмірнову на пабудове:

— Бачыш, усё высьветлілася. ніхто з нас ніколі і ня верыў тэй агіднай сьплетні, якая была пушчана пра цябе,—гаварыў старшыня рабочкому.

— Але што гэта я. Зусім запамятаў. Сёньня ў нас сход рабочых; твой даклад аб выкананьні прамфінпляну. Ці-ж ты зможаш зрабіць?

— А чаму-жа не?—зьдзівілася Сьмірнова.—Нам трэба замацаваць той уздым, які маецца сярод рабочых. Так, трэба пагаварыць аб тым, каб яшчэ больш пашырыць сацспаборніцтва.

— Мы пабудову скончым у тэрмін!

І ЎДАРніцтвам ліквідуем прарывы ў прамфінпляне

САЦСПАБОРНІЦТВАМ



Завод хэмічна чыстай крэйды „Чырвоны Хэмік“ у Нова-Беліцы.

Акуляравая фабрыка ліквідуе прарыў.

(Віцебск).

Заключаны ў 1929 годзе дагавор па сацспаборніцтву з фабрыкай „Клара Цэткін“, акуляравай фабрыкай ганебна ня выкананы. За першае паўгодзьдзе фабрыка мае вялікі прарыў у справе выкананьня прамфінпляну. Плян недавыкананы на 14,36%.

Толькі пасьля зьмены партыйнага і прафэсыйнага кіраўніцтва фабрыкі, прамфінплян даведзен да варштатаў. Трэці квартал і пачатак чацьвертага даюць некаторыя дасягненьні ў выкананьні прамфінпляну за гэтыя кварталы.

У сучасны момант уся грамадзкасьць рабочых і работніц фабрыкі мабілізавана на задачах перавыкананьня прамфінпляну на чацьверты квартал, каб ліквідаваць прарыў за першае паўгодзьдзе.

Гэтаму перавыкананьню садзейнічае разгортваньне ўдарніцтва, якім у студзені месяцы было ахоплена толькі 9% рабочых. У чэрвені ўжо 50% рабочых і работніц вайшлі ва ўдарныя брыгады. Павялічыўся лік рабочых прапаноў, якіх за тыдзень бывае да 119; адміністрацыя прыступіла да правядзеньня іх у жыцьцё.

Значная ўвага рабочых была зьвернута на тое, каб зусім перайсьці на сыравіну савецкага вырабу, не прыбягаючы да імпарту. Гэты пералом ужо зроблен. Калі год таму назад—з-за мяжы прывозілі розныя рэчы для акуляраў, дык зараз фабрыка абсталявана новымі станкамі і машынамі, якія выраблюць усе патрэбныя рэчы для акуляраў, даючы гэтым вялізарную эканомію.

Маецца паляпшэньне і ў справе зьніжэньня сабекошту і зьнішчэньня браку і прагулаў. Сабекаштоўнасьць зьніжана з 8% да 11%, брак зьнізіўся з 14% да 8%, а прагулаў зусім ня стала, бо вельмі моцна грамадзкасьць ударыла па іх.

У сувязі з пераходам на бесьперапынку і двухзьменую работу, патрабуецца значная колькасьць кваліфікаваных рабочых, а іх пакуль няма. Але і ў гэтай галіне вядзецца праца: з Біржы працы набраны каля 200 новых рабочых, якія атрымліваюць зараз кваліфікацыю.

Пашырэньні фабрыкі і рэарганізацыі яе ў акуляравы-гадзінны камбінат будзе выканана. **Н. К.**

Не мабілізавана ўвага рабочых.

На нашай фабрыцы „Вэзуві“ праверка сацспаборніцтва прайшла габінэтна.

Вылучылі дабраахвотныя брыгады для праверкі, разьмеркавалі іх па цэхах, але брыгады працавалі самастойна, не прыцягваючы да актыўнага ўдзелу ўсю масу рабочых. Усё гэта падкрэсьліў сход рабочых па дакладу старшага брыгадзіра. На фабрыцы адзін цэх залежыць ад другога. Кепская праца аднаго цэху перашкаджае выконваць прамфінплян другому.

Яшчэ часта ў нас псуецца кацёл. Трэст не клапоціцца аб устаноўцы новага катла і таму гэта выклікае частыя прастоі. **П. Ш.**

Н.-Беліца.

Піанэры вядуць барацьбу з прагуламі і рвацтвам.

Даб'емся паляпшэньня працы з дэлегаткамі

Абвясьцілі сябе ўдарніцамі.

На дэлегацкім сходзе калгасу „Зьвязда“ Сьмілаўскага раёну па дакладу аб уборцы ўраджаю была ўнесена прапанова стварыць ўдарную брыгаду. Спачатку некаторыя жанчыны імкнуліся гэту прапанову адхіліць, але пасьля растлумачэньня аб значэньні ўдарніцтва, прапанова была прынята.

У першую чаргу абвясьцілі сябе ўдарніцамі і запісаліся ва ўдарную брыгаду **Казлоўская Надзя і Ілюцка Мальвіна;** за імі пачалі запісвацца і другія.

Стварылася першая ўдарная брыгада з шасьці чалавек. Пры першых-жа работах у полі ўдарніцы паказалі прыклад лепшай узорнай работы як па якасьці, гэтак і па колькасьці. Яны паказалі, што яны ўдарніцы ня толькі на словах, але і на справе.

Па іх раўняюцца і другія, Але дрэнна, што няма сталага вучоту якасьці і колькасьці працы ўдарнікаў.

Трэба яго весьці і лепшых ударніц прэміраваць.

Калгасьніца **Шаціла.**

Не адстаем.

26 ліпеня 1930 году адбыўся сход яўрэйскіх дэлегатак сумесна з працоўнымі жанчынамі ўсяго мястэчка Халопенічы, на якім стаяла пытаньне аб пазыцы „Пяцігодка ў чатыры гады“.

Шляхам сацспаборніцтва дэлегаткі падпісваліся адна за другой і выклікалі не дэлегатак, большасьць якіх таксама падпісалася.

Для збору грошай вылучаны ўпаўнаважаныя, якія зараз прыступаюць да працы.

м. Халопенічы,
Менскай акругі.

Златкіна.

Дэлегацкі сход зусім не працуе.

Пры Кліноцкім сельсавеце маецца жаночы сход дэлегатак. Па пляну сход павінен адбывацца кожны тыдзень, але нашы працаўнікі на гэта не зьвяртаюць увагі. Роўна тры месяцы прайшло, як не адбываўся дэлегацкі сход, а калі да іх зьвяртаюцца пра сход, дык яны адказваюць:— „мы работай перагружаны“.

С. Путрык.

в. Клінок, Кліноцкі с.-с.
Чэрвенскі раён, Меншчына.

Дэлегацкі сход заснуў.

У калгасе імя „Чарвякова“ вясеньняя пасеўкампанія прайшла здавальняюча. Клін вясеньняга севу засеян на 100 проц.

Усе сябры калгасу абвясьцілі сябе ўдарнікамі па выкананьні пляну вясеньняга севу.

Дагляд за пасевамі добры.

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі прайшла здавальняюча.

Дэлегацкія сходы ў нас зараз зусім не працуюць. Узімку трохі працавалі, а ў сучасны момант нічога ня робіцца. Партыйная ячэйка і райком КП(б)Б ніякай увагі на гэту працу не звароч-ваюць.

Пастановы 13-га зьезду КП(б)Б распрацоўваліся толькі на адным сходзе калгасьнікаў.

Бытавая камісія створана пры сельсавеце, але працы ў ёй ніякай няма таму, што гэта камісія ня ведае нават сваіх абавязкаў, а з раёну не даецца паказаньняў, як працаваць. У нашым сельсавеце створаны ясьлі ў калгасе „Ленінскі Шлях“, але праца ў іх не пастаўлена як трэба з-за адсутнасьці цацак і адзеньня.

Бярэзінскае спажыўтаварыства, відаць, што мала зварачвае ўвагі на тое, каб задаволіць у першую чаргу ясьлі.

Ігнатовіч Надзя.

Бярэзінскі раён, Белічанскі с.-с.
в. Белічаны.

Праца сярод жанчын заняпала.

Праца сярод жанчын у Рудзенскім сельсавеце ў летні час зусім заняпала. Дэлегацкія сходы ня склікаюцца, збор грошай на трактар імя „Белрабсялянка“ не праводзіцца. Жанчыны ня чытаюць сваёй часопісі. **Камсамольская і партыйная ячэйкі зусім малую ўвагу зьвяртаюць на працу сярод жанчын.**

Жанчыны-калгасьніцы і не калгасьніцы яшчэ нічога ня ведаюць аб 13-м зьезьдзе КП(б)Б і аб XVI зьезьдзе ВсеКП(б).

Коўзель Р.

Рудзенск, Рудзенскі с-с
Сьмілавіцкі р-н, Менск. акр.

т. Шчэмелёва, вылучаная адказным сакратаром ЦП саюзу рабзямлес.

Няма працы з дэлегаткамі.

На фабрыцы „Камунарка“ спынілі склікаць дэлегацкія сходы. Ужо тры месяцы прайшло і ніводнага сходу ня было. Дэлегаткі ня выконваюць свае нагрузкі, а некаторыя нават ня маюць ніякай нагрузкі.

Партячэйка нічога ня робіць, каб наладзіць работу дэлегацкага сходу, ніякіх мер ня прымалася да дэлегатак, якія не наведвалі раней сходы. Хто-ж у гэтым вінаваты?

Рабкорка Фэльдман.

Менск.

Сялянкі в. Романовіч на адпачынку пасьля зграбаньня сена на сенажаці.

Бытавых камісій няма, ясьляў нідзе не адчыняюць.

Пры Рудзенскім сельсавеце, яшчэ і да гэтага часу ня складзена бытавая камісія. Сельсавет і дэлегацкі сход ня ведаюць, што гэта за зьвер—бытавая камісія. Зразумела, што па Рудзенскаму сельсавету няма ніводных ясьляў.

Неабходна сельсавету зараз стварыць бытавую камісію, бо на яго тэрыторыі маецца 6 калгасаў, дзе трэба адчыніць ясьлі, каб даць магчымасьць жанчынам прыняць удзел у працы калгасу.

Коўзель Р.

ЯК УБІРАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ ГАРОДНІНУ

Зараз наша ўлада прыдае надзвычайна вялікае значэньне гародніцтву, бо яно грае не малую ролю ў справе забесьпячэньня гарадоў гароднымі расьлінамі; трэба дабівацца таго, каб гародніна даходзіла да спажыўца дабраякасная і каб процант псаваньня яе пасьля ўборкі быў зусім нязначным—нармальным.

Да ўборкі гародных расьлін, якія трэба захаваць узімку, неабходна прыступіць толькі тады, калі яны будуць зусім сьпелыя. Гародніна, захаваная ў нясьпелым выглядзе, хутка псуецца. Ні ў якім разе нельга рабіць уборку гародніны ў дажджлівае надвор'е, лепш за ўсё ў сонечныя дні, калі гародніна хутка і добра прасушваецца.

Нельга захоўваць на зімку гародніну, папсаваную грыбнымі хваробамі. Пры ўборцы гародніны трэба рабіць гэта асьцярожна, бо ня цэлая гародніна няпрыгодна для доўгага захоўваньня.

Уборку гуркоў трэба распачынаць тады, калі яны яшчэ ў зялёным выглядзе; збор гуркоў з жоўтай кажурой практыкуецца толькі тады, калі гуркі пакідаюцца для атрыманьня насеньня. Каб ня ўпусьціць тэрмін збору гуркоў, трэба зьбіраць іх праз 3—4 дні, што зразумела дае магчымасьць атрымаць большую колькасьць ураджаю.

Буракі ўвосень мала павялічваюцца і ня вытрымліваюць моцных марозаў, ад якіх гінуць альбо значна губляюць смак. Пагэтаму ўборку іх трэба пачынаць, як толькі наступяць першыя кволыя ранішнікі. Трэба асьцерагацца псаваньня карэньняў буракоў, бо калі выцякае сок, губіцца цёмны колер іх. Апрача гэтага папсаваныя карэньні буракоў няпрыгодны для доўгага захоўваньня. Пасьля выкапкі, карэньні буракоў, як і карэньні іншых карняплодаў: морквы, бручкі, рэпы, рэдзькі і іншыя, асьцярожна чысьцяцца ад зямлі. Лісьця буракоў зьнімаюцца, але не да галоўкі кораня, а пакідаюцца хвасткі даўжынёй прыблізна каля 2-х сантымэтраў.

Захоўваюцца буракі вельмі добра ў сухіх, праветрываемых скляпох.

Лісьця морквы пасьля выкапкі яе зьнімаюцца ўсе, нават і дробныя, бо пры захоўваньні морквы за рахунак спажыўных матэрый кораня, вытвараюцца новыя расткі, што адбіваецца на смаку морквы.

Пры захоўваньні ў больш вільготных скляпох, моркву магчыма класьці кучамі на паліцу ці на падлогу; у сухіх скляпох, каб корані морквы не перасыхалі, лепш за ўсё іх перасыпаць сухім пяском, укладваючы корані радамі.

Моркву магчыма захоўваць і ў ямах, якія робяцца таксама і для хаваньня бульбы.

Позьнія гатункі капусты, як броўншвэйгская, сабураўка і іншыя прыбіраюцца з гароду пазьней іншых гароднін таму, што ўвосень яны вельмі добра растуць і ня псуюцца ад марозаў да 3—5 градусаў. Раньнія гатункі капусты, якую спажываюць ўлетку, прыбіраюць з гародаў, як толькі яна высьпявае.

Бывае шмат выпадкаў, асабліва, калі палкае лета, што частка качаноў капусты трэскаюцца і тады лісьця ўнутры качана зелянеюць, капуста робіцца гаркаватай, мала прыгоднай для спажываньня.

Каб ацягнуць на два тры тыдні растрэсківаньне качаноў, трэба ў высьпеўшых качаноў абрубіць лапатай частку карэньняў, ці яшчэ лепш трохі ўзьняць расьліну з зямлі, альбо павярнуць на палову качан, альбо расхістаць яго; тады частка карэньняў абрываецца, капуста ў росьце прыпыняецца і качан ня трэскаецца.

Лепш за ўсё капусту захоўваць для спажываньня ў салёным выглядзе. Калі маецца патрэба ў захаваньні часткі ўраджаю капусты ў сьвежым выглядзе, трэба гэта рабіць наступным чынам: сьвежую капусту трэба захоўваць у скляпох сухіх, халодных, але не марозных. Калі скляпоў ня маецца, магчыма захоўваць капусту ў канавах, добра ўкрытых ад марозу. Качаны гэтыя захоўваюцца з карэньнямі, адсоўваюцца толькі знадворныя лісьця і валасьнікі.

Калгасьніцы за сарціроўкай маладой бульбы.



Менская малочная фабрыка.

Калі склеп вельмі сухі, дык лепш капусту пасадзіць карэньнямі ў зямлю ці пясок, а калі склеп троху сыры, трэба зьвязаць качаны і павесіць на жардзіны. Калі капусту захоўваць на невялікі час, прыкладна на 2—3 тыдні, дык яе магчыма захоўваць без карэньнаў. Наогул трэба сказаць, што захоўваньне капусты ў сьвежым выглядзе на зіму задача вельмі складаная—яна патрабуе на зіму добрага догляду.

Цыбуля-рэпчатка прыбіраецца, калі лісьця яе канчаткова пажаўцеюць. Цыбуля выдзёргіваецца з зямлі і пакідаецца, калі дазваляе надвор'е, на градах на некалькі дзён, каб яна абсохла. Пасьля гэтага іх дасушваюць у цёплым памяшканьні альбо на вольнай вышкі. Буйную цыбулю пасьля сушкі на градах лепш за ўсё пакласьці на каласьнікі гумна і там яе сушыць адзін два тыдні, пракапчываючы дымам. Пры гэткім захоўваньні цыбуля толькі ў рэдкіх выпадках дае насенную стрэлку. Ад цыбулі, якая захоўваецца ў прахладным памяшканьні, атрымліваецца заўсёды значная частка стрэлак, і тады цыбуліна ўжо для хаваньня ўзімку няпрыгодна. Асабліва добра захоўваецца цыбуля, калі яе пракурыць дымам. Для захаваньня цыбулі прыгодны жылыя пакоі, асабліва месцы ўблізі печак.

Добра зьвязваць цыбулю папарна ў пляцёнку і вешаць на жэрдзі ў цёплым памяшканьні. Таксама добра захоўваць цыбулю, калі злажыць яе на палацях, зробленых з круглых полак, у цёплым памяшканьні. Час-ад-часу цыбулю трэба перабіраць і адсоўваць загніўшыя, каб ня згубіць шмат здаровых. Перасушаная цыбуля зімой гніе. Цыбуля-ж сырая, у якой 2—3 павярхоўных пласта не прасохлі, звычайна таксама гніе.

Памяшканьне для захоўваньня гародніны могуць быць самыя рознастайныя: ямы, канавы, падпадлогі, бурты, кучы, скляпы, леднікі і іншыя. У гэтых памяшканьнях неабходна: па-першае раўнамерная тэмпэратура, адзін-два градусы цяпла па Рэамюру, па-другое—добрае праветрываньне, па-трэцяе, каб памяшканьне ня было надта сырым.

Ямы трэба капаць на сухім, высокім з пясчанай падглебай месцы, дзе няма блізка грунтавой вады і дзе ня будуць сьцякаючыя зьверху воды пранікаць да гародніны.

Калі няма высокага месца, лепш ямы капаць няглыбокія, і забясьпечваць гародніну ад марозу больш тоўстым пластом зямлі.

Велічыня ямы бывае большай часткай наступная: даўжыня па жаданьню, шырыня 1—1½ мэтры і глыбіня каля 1 мэтру.

У яму на зіму магчыма класьці толькі карняплоды і бульбу. Зялёных частак расьлін у яму класьці ня трэба. Гародніну трэба сыпаць у яму, як магчыма пазьней, лепш за ўсё пасьля першых марозаў, што часткова выратоўвае гародніну ад мышэй.

Для захоўваньня гародніны ад мышэй, трэба таксама разьмяшчаць ямы па магчымасьці далей ад жыльлёвых будынкаў і ад засьмечаных месц. Да часу ўкладкі гародніны ў ямы, трэба яе захоўваць пад паветкамі, альбо ў пунях, прыкрываючы ад падмарозкаў саломай. Сьцены ямы перад уборкай гародніны: буракоў, морквы, бручкі і бульбы лепш абкласьці саломай.

Для праветрываньня па сярэдзіне ямы ставіцца сноп саломы, альбо драўляная труба з дзіркамі па бакох. Пасьля ўкладкі гародніны горкай у яму, на яе кладуць пласт саломы, а на салому сыплюць пласт зямлі. Пакрыўку робяць у сярэдзіне некалькі вышэй, каб з яе добра сьцякала вада.

Пры ўкладцы гародніны ў ямы, канавы ці бурты неабходна вясной, як магчыма хутчэй, расчыніць іх і карняплоды перанесьці ў іншае месца, дзе магчыма іх захоўваць ад лёгкіх падмарозкаў, бо інакш значная частка гародніны можа загінуць.

Садавод Ражкоў.

ПАРАДЫ ЎРАЧА

Чаму ў жанчыны бывае бясплоднасьць?

Многія жанчыны змагаюцца супроць частай цяжарнасьці, але жанчыны ня маючыя дзяцей, ці толькі адно дзіця, часта шукаюць сродкі і гатовы на розныя апэрацыі, каб толькі зацяжарыць.

Такіх жанчын маецца вельмі многа. Пабачым ад якіх-жа прычын жанчына застаецца бясплоднай.

Гэтых прычын некалькі:

1) Жанчына ня можа зацяжарыць і застаецца на ўсе жыцьцё бязьдзетнай у тым выпадку, калі яе палавыя ворганы—**матка, трубы і яічнікі мала разьвіты і знаходзяцца ў дзіцячым становішчы,** ці калі ў яе маецца ўражонае адсутнічаньне гэтых органаў. У гэтакіх жанчын і дзяўчат ніколі ня бывае мэнструацый і яны наогул фізычна мала разьвіты.

2) Цяжарнасьць можа не наступіць, калі ў жанчыны маецца **сужэньне канала, шэйкі маткі, бо тады мужское семя** ня можа папасьці ў матку.

3) Жанчына прызначана на бясплоднасьць, калі яна хварэе **хранічным васпаленьнем труб і яічнікаў,** што большай часткаю бывае ад трыпэра (ганарэі). У трубах тады знаходзіцца гной, ці каналы іх сьціснуты рознымі зрашчэньнямі і робяцца непрахадзімымі для семяных клетачак (жыўчыкаў).

Запладненьне ў гэтых выпадках немагчыма.

4) Цяжка інады зацяжарыць, калі маецца **загіб маткі** назад і зьмяшчэньня труб і яічнікаў.

5) **Пры катары ўлагалішча і маткі** бываюць значныя выдзяленьні (белі) і часта кіслага характару, а кіслата ўбівае жыўчыкаў, яны робяцца нярухомымі і ня могуць прасоўвацца ў палавы канал.

6) Вельмі рэдка бывае зачацьце пры **вялікіх пухлінах** (наростах) маткі і яічніка.

7) Бясплоднасьць наглядаецца ў тых жанчын, якія пры першай цяжарнасьці зрабілі сабе **аборт.**

Часта жанчына, жадаючы зрабіцца маткаю, звароцца за дапамогай да розных урачэй, ёй робяць апэрацыю, а цяжарнасьць усё-ж не наступае.

На гэтай глебе ўзьнікаюць сямейныя нелады: муж нездаволены, што жонка не дае яму дзяцей. Ён лічыць сябе зусім здаровым і на выгляд ён сапраўды здароў.

Але калі дасьледваць яго семя, дык аказваецца, што ён віноўнік у бясплоднасьці: у яго семені зусім адсутнічаюць жыўчыкі (спэрматазоіды) альбо іх вельмі мала і яны зусім нярухомы.

Калі запытаць мужа, дык высьветліцца, што ён калісьці хварэў трыпэрам і васпаленьнем абоіх яічак. Таму яго семя зусім ня прыгодна для апладненьня.

Вядома, што на 100 бясплодных шлюбаў у 25—30 выпадках бясплоднасьць залежыць ад мужчыны.

Вось тыя прычыны, якімі тлумачыцца бясплоднасьць жанчыны. У кожным выпадку, калі бясплодная жанчына жадае мець дзіця, ёй трэба зьвярнуцца да ўрача.

Чытачкі для таго, каб уявіць сабе, як адбываецца апладненьне, ці зачацьце прачытайце ў № 7 нашай часопісі артыкул „Гігіена жанчыны“. Д-р **М. Поляк.**

Першая дапамога дзецям у няшчасных выпадках.

З дзецьмі часта бываюць самыя рознастайныя няшчасныя выпадкі. Яшчэ часьцей маціры ў такіх выпадках цяраюцца, ня ведаючы, што рабіць, альбо робяць то, чаго ня трэба рабіць і наносяць шкоду дзіцяці. Мы дадзім шэраг парад, як аказаць першую дапамогу дзіцяці пры няшчасных выпадках, найбольш часта сустракаючыхся, калі дапамогу дзіцяці трэба аказаць безадкладна, не чакаючы ўрача.

Корчы ў дзяцей у першыя 2—3 гады іх жыцьця — ня рэдкае зьявішча. Бываюць корчы галасавой шчыліны ці агульныя корчы, так званыя „радзімчыкі“. Корчы галасавой шчыліны зьяўляюцца ў дзіцяці ў большасьці нечакана, калі дзіця на выгляд здароў. Прыпадак робіцца альбо калі дзіця крычыць, ці калі яно спакойна. Дзіця робіць сьвісьцячы ўздых, яно перастае дыхаць, твар яго сінее, яно задыхаецца і, нарэшце, пачынаюцца агульныя корчы — падзёргіваецца твар, закатваюцца вочы, ручкі і ножкі сударажна выцягваюцца, ствараецца ўражаньне, што дзіця гіне. Корчы цягнуцца некалькі сэкунд пасьля чаго корчы раптам спыняюцца, дзіця пачынае дыхаць, і праз некалькі хвілін ужо сядзіць на сваім ложку яшчэ спалоханае і стомленае але ўжо здаровае.

У большасьці выпадкаў сударагі галасавой шчыліны канчаюцца добра і толькі ў рэдкіх выпадках дзіця памірае.

Што-ж рабіць пры сударагах галасавой шчыліны?

Калі дзіцяці не хапае паветра, яго апырсківаюць невялікай колькасьцю студзёнай вады. Калі-ж прыступ зацягваецца, то пальцам аддаўліваюць аснаваньне языку і дапамагаюць дзіцяці штучным дыханьнем.

З таго моманту, як дзіця зробіць удыханьне, лепей за ўсё спыніць усялякае ўмяшацельства і толькі, калі дыханьне не вазабнаўляецца ў большменш правільнай форме, трэба працягваць штучнае дыханьне.

Прыступ агульных корчаў ад якіх-бы прычын ён ні залежыў, заўсёды аднолькавы. Розьніца толькі ў тым, што ў аднаго дзіцяці прыпадак працягваецца дольш, корчы мацней, а ў іншых слабее. У адных дзяцей корчы раз зьявіўшыся, потым не паўтараюцца на працягу іх далейшага жыцьця, у іншых-жа корчы зьяўляюцца ў розных выпадках — калі пачынаецца ліхаманкавая хвароба, калі кішэчнік не ў парадку, калі дзіця моцна хвалюецца.

Кожны асобны прыступ агульных корчаў пачынаецца звычайна гэтакім чынам: дзіця перастае дыхаць, вочы яго закатваюцца пад верхняе века, твар сінее, сьпіна выгінаецца, рукі, ногі выцягваюцца; праз некалькі сэкунд твар і вочы пачынаюць падзёргівацца, язык рухаецца ўзад і ўперад, інады паказваецца пена з роту, усё цельца дзіцяці падзёргваецца. Такі прыступ корчаў працягваецца 1—2 хвіліны, рэдка больш 3—5 хвілін. Пасьля прыступу дзіця звычайна засыпае і прасынаецца праз некаторы час больш-менш змораны. Як ні цяжкі выгляд дзіцяці ў час прыступу корчаў, усё-ж і агульныя корчы таксама мала небясьпечны для жыцьця, як і сударагі галасавой шчыліны.

Пры агульных сударагах, карысна зрабіць клізму, на галаву трэба пакласьці пузыр з лёдам, ці проста прымочку з студзёнай вады. Калі ў дзіцяці высокая тэмпэратура (жар), дык трэба зрабіць ванну (39—30° па Цэльсію), калі дзіця зможа праглынуць і ў яго няма паносу, яму трэба даць 1—2—3 чайных лыжачкі касторавага масла, у залежнасьці ад узросту.

Дзіця неабходна ў далейшым паказаць урачу, высьветліць прычыну зьяўленьня корчаў. Пры правільным лячэньні магчыма пазбавіць дзіця ад паўтарэньня прыступаў корчаў.

(Перавод з расійскага). **Д-р Пратоклітаў.**

Маем ясьлі.

„Мы рады, што маем ясьлі“, гэтак кажуць сялянкі, у асаблівасьці калгасьніцы. Яны рады з прычыны таго, што ў гарачую пару лета (у час працы) маці спакойна працуе ў полі, яна ведае, што яе дзіця добра выхоўваецца ў дзіцячых ясьлях.

Дзіцячыя ясьлі працуюць з 20 чэрвеня і разьлічаны на 25 дзяцей. Ясьлі адчынены з 7 гадзін раніцы да 6 гадзін увечары. У памяшканьні ясьляў чыстата і добры санітарны догляд.

Таксама ясьлі добра абсталяваны.

С. Путрык.

Ясьлі ў калгасе.

Што зроблена па допісах рабселькорак.

Злачынцы панесьлі пакараньне.

Сялькорка з в. Смалаўкі нам пісала аб тым, што з боку заможнікаў былі замахі на **Пад'янец Просю** за актыўную работу па калектывізацыі.

Факты, паказаныя ў заметцы, пацьвердзіліся і судом. Вінаватыя: **Радкевіч Янка і Зінковіч Язэп—прыгавораны да пазбаўленьня волі па аднаму году.**

Сакратар сельсавету Радкевіч Антось з працы здымаецца.

Допісы не пацьвердзіліся.

Па заметцы аб няправільным звальненьні машыністкі Пісьман на заводзе „Чырвоны Хэмік" (Гомель) **акруговая інспэкцыя працы** паведаміла, што Пісьман правільна пераведзена на вытворчасьць, бо з працай машыністкі-справавода яна не спраўлялася.

* * *

Уваравіцкі райком па заметцы аб кепскай працы буфэтчыцы Чарняўскай у сталоўцы ЦРК паведаміў, што сталоўкі ЦРК і буфэтчыцы Чарняўскай няма ва Ўваравічах.

Паштовая скрынка.

М. Чубару.—Вершы „Паравоз" перасланы ў „Маладняк". Аб зборы сродкаў на трактар друкаваць ня будзем, бо аб усім тым, што ня робіцца немагчыма напісаць. Вы пішаце аб тым, што настаўніцы ня цікавяцца гэтай працай. Вось вам, як селькорукактывісту і патрэбна ўзяць на сябе ініцыятыву гэтай справы.

Рыгору.—Заметкі „Чаму праца ўснўла" і „Пра сілакаваньне ня ведаюць" мы пераслалі Сьмілавіцкаму Райкому КП(б)Б.

Дарожнаму.—Аб уборцы ўраджаю ў вашым калгасе мы ўжо пісалі.

Мухе.—Допіс аб батрачцы пасланы на расьсьледваньне Чэрвенскаму Райкому КП(б)Б. Аб ячэйцы Асоавіяхіму пераслана ў „Чырвоную Зьмену".

Кубкоўскай Таццяне. Тэрмінова паведаміце ваш адрас.

Чубару.—Допісы „Уздымаюцца новыя сілы" і іншыя ня пойдуць, бо нічога канкрэтнага няма, а толькі агульныя словы.

Адказы на запытаньні.

Т. Шаўвянец.—Права на пэнсію ад страхавых ворганаў маюць тыя рабочыя, якія праработалі да 8-мі год па найму. Пры гэтым заява аб прызначэньні пэнсіі павінна быць падана не пазьней як праз два гады са дню сканчэньня работы.

Да ведама рабкорак і аўтараў гор. Менску.

Рэдакцыя паведамляе, што выдача ганарару за артыкулы і заметкі, зьмешчаныя ў часопісі, утвараюцца ў канторы выдавецтва „Зьвязда" (Савецкая, 63).

„Беларуская Работніца і Сялянка".

з студзеня 1930 году выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць у выдавецтва „Зьвязда" (Савецкая, 63).

Часопісь каштуе— 1 месяц: . . . . 20 капеек; 3 месяцы . . . 60 „; Паўгода. . . 1 р. 20 капеек; Год . . . . 2 „ 40 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Упаўнаважаныя па падпісцы атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бядняцкая і серадняцкая—павінна чытаць сваю часопісь „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА". Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопісь.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопісь.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Карла Маркса, 14, тэлефон—5-85.

Выданьне **ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары* **Н. Бурава. Г. Рагазіньнікава.**

ГПБ Ср. Аз.

Цана 10 кап. 1038

СТАРОНКА РУЧНОЙ ПРАЦЫ



Мэдальён для сарочкі.



Вышыўка мярэжкай з рэшыльле.



Вышыўка мярэжкай гладзьдзю.



Вышыўка пецельным швом.

Друкарня БДВ імя Сталіна. Заказ № 2259. У ліку 9 700 Галоўлітбел № 857.